# Правапіс *не(ня)* з прыметнікамі

Урок беларускай мовы ў 6 класе

**Ж. Л. Васюковіч**,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі,
СШ № 15 г. Пінска

Урок вельмі цікавы і жывы, таму што насычаны шматлікімі інтэрактыўнымі метадамі, што пабуджае вучняў да актыўнага пошуку, сэнсатворчасці, дае магчымасць самарэалізацыі, развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці і творчых здольнасцей.

**Тэма: Правапіс не(ня) з прыметнікамі ў VI класе**

**Напрыканцы ўрока вучні**

**будуць ведаць**: правіла напісання *не(ня)* з прыметнікамі;

**будуць умець:**

прымяняць неабходны алгарытм разважання;
адрозніваць прыметнікі, якія без *не(ня)* не ўжываюцца;
падбіраць да прыметнікаў сінонімы ці блізкія па значэнні выразы;
правільна ўжываць прыметнікі з *не (ня)* ў вусным і пісьмовым маўленні;
фарміраваць культуру індывідуальнай і калектыўнай вучэбнай дзейнасці.

**Тып урока**: вывучэнне новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** Красней В. П. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання (В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль, С. Р. Рачэўскі. –Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2015); Клышка М. К.Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў (Мінск: Вышэйш. шк., 1993).

**Эпіграф:**

Слова! Цуд найвялікшы між цудаў-дзівосаў,
Што здзіўляў у вяках і здзіўляе нанова.
Трапяткое, жывое, як сонца ў росах,
**Несмяротнае,** роднае матчына слова. (Н.Гілевіч)

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант.**

**Метад "Усміхніцеся, калі…"**

-у вас добры настрой;
-хто хоча даведацца на ўроку што-небудзь новае;
-у каго не ўзнікла пытанняў пры выкананні дамашняга задання;
-хто добра засвоіў папярэднюю тэму.

Гэты метад спрыяе стварэнню эмацыянальнага настрою, абуджае цікавасць вучняў да ўрокаў беларускай мовы, настройвае на працу.

**II. Этап праверкі д/з. “Правапіс складаных прыметнікаў”.**

Выкарыстоўваю метады сэнсатворчасці (вучні вызначаюць узровень засваення папярэдняга матэрыялу). **Інтэрактыўны тэст “Атрымай 9”.**

**Заданне.** Абазначце складаныя прыметнікі, якія пішуцца разам, пазначце нумары правільных адказаў у суадносных клетках зорачкамі і злучыце іх.

| | | |
|---|---|---|
| | * | * |
| | * | * |
| | | * |
| 0 | **1*** | **2*** |

1. Залаціста(ружовы)
2. Інша(моўны)
3. Бела(грывы)
4. Паўночна(заходні)
5. Блакітна(вокі)
6. Руса(валосы)
7. Горка(салёны)
8. Шахматна(шашачны)
9. Вечна(зялёны)
10. Руска(беларускі)
11. Сарака(тонны)
12. Заходне(беларускі)

Хто справіўся правільна з заданнем, у таго павінна атрымацца дзявятка.

**III. Матывацыйны этап.**

**Метад “Адтэрміновая адгадка”.**

Спачатку разам з вучнямі вызначаецца сэнс радкоў, а затым праводзіцца арфаграфічная работа па эпіграфе (схавана арфаграма, якая будзе вывучацца на гэтым уроку).

Звярніце ўвагу на эпіграф да сённяшняга ўрока, растлумачце яго сэнс.

– Пра якое слова кажа нам паэт? Як ён яго характарызуе? Чаму слова ***несмяротнае*** пішацца разам? Якая тэма сённяшняга ўрока? (Вучні самастойна вызначаюць тэму ўрока). “Правапіс -не(ня)- з прыметнікамі”.

Правядзенне такой работы стварае праблемную сітуацыю, пазнавальную і эмацыянальную настроенасць, абуджае цікавасць, заінтрыгоўвае вучняў новым матэрыялам.

**IY. Актуалізацыя апорных ведаў па тэме “Правапіс *не (ня), ні* з назоўнікамі”.**

Пры вывучэнні якой часціны мовы вы вывучалі правіла “Правапіс не (ня) …” (адказ вучняў: “Правапіс не (ня) з назоўнікамі”).

**Метад “Лагічны ланцужок”.** Вучням неабходна размеркаваць назоўнікі на тры групы, убачыўшы заканамернасць, і скласці алгарытм рашэння праблемы.

(Ня,не)смеласць, (не,ня)ахайнасць, (не,ня)забудка, (не,ня)пагадзь, (не, ня)вольнік, (не,ня)прыяцель, (не,ня)воля, (не,ня)ўвага, (не,ня)шчасце, (не) таварыш, а вораг, (не,ня)праўда.

Адказ: 1. Слова не ўжываецца без не(ня). 2. Можна замяніць сінонімам. 3. Супрацьпастаўленне.

Гэты метад развівае пазнавальныя здольнасці вучняў, павышае інтарэс, развівае творчае мысленне, уменне аналізаваць, класіфікаваць.

Вучні займаюцца ўзаемаправеркай слоў, узнаўляецца правіла напісання *не (ня)* з назоўнікамі.

Утварыце ад першых двух слоў прыметнікі (нясмелы, неахайны). Ці ведаеце вы дакладна, як трэба пісаць (не,ня) з прыметнікамі. Што трэба зрабіць, каб вывучыць тэму?

**V.Вызначэнне мэты і задач урока**

Вучні самастойна фармулююць задачы ўрока. **Метад "Разам будуем дом" (Дадатак 1).** Удзельнікі запісваюць задачы на ўрок на лісціках-"бярвеннях", як толькі задача выконваецца, іх наклейваюць на свабоднае месца ў макеце дома. Да канца ўрока макет дома пабудаваны – правільна арганізаваны ўрок.

**VI. Аперацыйна-пазнавальны этап**

**1.** Знаёмства з новым матэрыялам.

На гэтым этапе я аддаю перавагу групавой форме работы, бо ўпэўнілася, што актыўным вучань становіцца тады, калі працуе ў камандзе. Пры групавой форме работы кожны вучань мае магчымасць выказаць сваё меркаванне, яны больш думаюць, а не проста механічна запамінаюць матэрыял, самастойна і ўсвядомлена "адкрываюць" веды, замацоўваюць і абагульняюць іх. **Метад "Дрэва рашэнняў" (Дадатак 2).** Групы робяць запісы на сваім дрэве, а потым мяняюцца месцамі і дапісваюць на дрэвах "суседзяў" свае ідэі. Пасля ў групах адбываецца абмен і ўзаемаправерка выкананых заданняў.

2. Засваенне новых ведаў. Пр.256. **Метад "Знайдзі пару" (**вучні вучацца падбіраць на кожны прыклад пункт правіла (з пр.255 з тлумачэннем).

**3.** Фізкультхвілінка *(2-3 хв.).*

**YII. Трэніровачна-карэкцыйны этап**

**Метад "Суадносіны".** Да прыметнікаў падабраць сінонімы з *не(ня).* Вучні вучацца падбіраць сінонімы, папаўняць слоўнікавы запас вучняў.

1) Святы, чысты (чалавек);
2) бясплодны, галодны (год);
3) дзікаваты, звераваты (чалавек);
4) круты, камяністы (шлях);
5) унікальная (памяць);
6) безыменны (герой);
7) гаротны, абяздолены (чалавек);
8) малы (пакунак);
9) моцны (абутак);
10) вузкая (сцежка).

**Адказ:** 1. Невінаваты; 2. Неўрадлівы; 3. Нелюдзімы; 4. Небяспечны; 5. Незвычайная; 6. Невядомы; 7. Нешчаслівы, няшчасны; 8. Невялікі; 9. Нясносны; 10. Нешырокая.

**2. Інтэрактыўная гульня "Карэктар".**

Гэта гульня дапамагае развіваць у вучняў аналітычныя здольнасці, фарміраваць арфаграфічную пільнасць, павышаць усвядомленасць у прымяненні правіл.

Заданне: выправіць памылкі.

1.Невялікі.
2.Не роўны.
3.Невясёлы, а сумны.
4.Не далёкі, а блізкі.
5. Няўрадлівы.
6.Неглыбокі, але шырокі.
7.Не шырокі, а вузкі.
8.Нічуць нелепшы.
9.Далёка нелёгкі.
10.Не старэйшы за яго.

**Адказ:** нbackslashroўны, не вясёлы, а сумны, неўрадлівы, не глыбокі, але шырокі, нічуць не лепшы, далёка не лёгкі.

**YIII. Праца з дэфармаваным тэкстам. Поўны аналіз тэксту.**

Вучні развіваюць чытацкія ўменні, навыкі аналізу тэксту. Кожная група працуе з часткай тэксту (пасля выканання заданняў групы павінны размясціць часткі тэксту ў пэўным парадку)**. Метад "Канструктар".**

Заданне: спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і выбіраючы адпаведнае напісанне не ці ня з прыметнікамі, сфармулюйце правіла, якім карысталіся.

У бярэзніку

Над шырокаю лагчынаю ўзвышаўся *(не,ня)*вялікі бярэзнік. (Не,ня)маладыя дрэвы раслі вельмі цесна, і нічыя сякера не чапала іх стройных камлёў.

(Не,ня)густы, але амаль суцэльны цень клаўся ад дробнага лісця на мяккую і тонкую траву. Прамяні сонца залілі ўвесь гай моцным, хоць і (не, ня)яркім святлом.

Усюды блішчалі расінкі. Было ўжо так светла і так яшчэ ціха.

Чуліся толькі (не, ня)смелыя галасы жаваранкаў, ды ў самым гаі дзве-тры (не,ня)вялікія птушкі выводзілі свае (не,ня)звычайныя спевы.

(Паводле Якуба Коласа).

1) Вызначце стыль тэксту і тып маўлення, яго асноўную думку.
2) Растлумачце правапіс (не, ня) з прыметнікамі.
3) Прыметнікі з (не, ня) замяміце прыметнікамі-сінонімамі без не.

**IX. Творчасць вучняў**

Складзіце і запішыце сказы (парамі) са словамі, каб прыметнікі з не(ня) пісаліся злітна і асобна. Невясёлы, невялікі, нялёгкі, нядобры, няроўны.

**X. Кантрольна-ацэначны этап**

Выканаўшы вынiковае заданне ўрока, вучні вызначаюць узровень засваення матэрыялу і ступень дасягнення задач, пастаўленых на пачатку ўрока.

**Інтэрактыўны тэст "Малайцы".**

Заданне: адзначце нумары адказаў, дзе не (ня) з прыметнікамі напісаны правільна.

**М**)Нечаканы ўдар;
**А**)Неадольная смага;
К)Не знаёмы чалавек;
**Л**)Зусім не вядомы чалавек;
**А**)Не горшы за суседа;
Н)Не шырокі праезд;
**Й**)Неабсяжны прастор;
**Ц)**Нераствaральны элемент;
**Ы**)Не старэйшы за сяброўку.

Павінна атрымацца слова "Малайцы".

**XI. Падвядзенне вынікаў урока, выстаўленне адзнак. Зваротная сувязь: метад "Разам будуем дом…".**

**XII. Дамашняе заданне:** 42, практ. 259 (пісьмова).

**XIII. Рэфлексія. Метад "Тры М"**. Вучні называюць 2 моманты з тэмы, якія запомнілі добра, і 1 момант, што не зусім атрымаўся.